

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 31 (186) 15 ліпеня 1992 года*

# *СПЕЦВЫПУСК «АБІТУРЫЕНТ»*

## ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ АБ ´ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА ДЗЁННУЮ І ВЯЧЭРНЮЮ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ НА 1992-93 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

**Прыём заяў з 25 чэрвеня па 15 ліпеня. Уступныя экзамены праводзяцца з 16 па 31 ліпеня.**

**Да заявы аб прыёме прыкладаюцца:** дакумет аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 фатакартак памерам 3х4, медыцынская даведка па форме № 086-у; а на навучанне без адрыву ад вытворчасці і выпіска з працоўнай кніжкі. Па прыбыцці ва універсітэт абітурыенты прад ´яўляюць пашпарт.

На навучанне прымаюцца асобы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Уступныя экзамены дзеляцца на **профільныя (конкурсныя),** якія ацэньваюцца па пяцібальнай сістэме, і **няпрофільныя,** якія ацэньваюцца па сістэме «залік» і «незалік».

## ДЗЕННАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ

Абітурыенты, якія паступаюць на дзённую форму навучання, здаюць наступныя экзамены:

на спецыяльнасцях, спецыялізацыях і дадатковых напрамках падрыхтоўкі:

**радыёфізіка і электроніка:** профільныя — фізіка (пісьмова), фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская літаратура (вусна);

**аптычныя прыборы і сістэмы:** профільныя — фізіка (пісьмова), фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская літаратура (вусна);

**фізіка:** профільныя — фізіка (пісьмова), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка:** профільныя — матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — фізіка:** профільныя — матэматыка (пісьмова), фізіка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

**матэматыка (вытворчае аддзяленне):** профільныя — матэматыка (пісьмова), фізіка (вусна), беларуская літаратура (вусна) і няпрофільны — інфарматыка (вусна);

**біялогія, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — хімія:** профільныя — біялогія (вусна), хімія (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна) і няпрофільны — матэматыка (вусна);

**біялогія, дадатковы напрамак падрыхтоўкі— практычная псіхалогія:** профільныя — біялогія (вусна), хімія (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна) і няпрофільны — матэматыка (вусна);

**біялогія, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — геаграфія:** профільныя — біялогія (пісьмова), геаграфія (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна) і няпрофі льны — матэматыка (вусна);

**гісторыя, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — англійская мова, нямецкая мова, французская мова:** профільныя — гісторыя (пісьмова), замежная мова (у адпаведнасці з выбраным напрамкам падрыхтоўкі) (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне);

**правазнаўства (шырокі профіль):** профільныя — гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне);

**правазнаўства, спецыялізацыя — знешнеэканамічная дзейнасць і міжнароднае права:** профільныя — гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне);

**міжнародныя эканамічныя адносіны, спецыялізацыя — міжнароднае права:** профільныя — гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне) і няпрофільныя — матэматыка (вусна);

**беларуская мова, літаратура і культура; польская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура:** профільныя — беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова (вусна), беларуская літаратура (вусна) і няпрофільны — руская мова і літаратура (вусна);

**руская мова і літаратура; польская мова і літаратура і руская мова і літаратура:** профільныя — руская мова (дыктоўка), руская мова (вусна), руская літаратура (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна).

Абітурыенты, якія паступаюць на спецыяльнасці, звязаныя з вывучэннем польскай мовы і літаратуры, праходзяць субяседванне па польскай мове, якое праводзіцца да пачатку ўступных экзаменаў;

**руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура:** профільныя — руская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна) і няпрофільны — замежная мова (вусна);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — музыка:** профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), музыка і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — выяўленчае мастацтва:** профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), малюнак і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**педагогіка і методыка пачатковага навучання, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — методыка выхаваўчай работы:** профільныя — беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), гісторыя (вусна) і няпрофільны — руская мова (дыктоўка);

**выяўленчае мастацтва, айчынная і сусветная культура:** профільныя — кампазіцыя (тэматычнае заданне), малюнак (нацюрморт), жывапіс (нацюрморт), беларуская мова (дыктоўка) і няпрофільны — гісторыя (вусна). Перад падачай дакументаў абітурыенты праходзяць субяседванне па спецыяльнасці. На субяседванні абітурыенты павінны мець з сабой работы па малюнку, жывапісу і кампазіцыі;

**музыка, айчынная і сусветная культура: профільныя** — специнструмент, тэорыя музыкі, беларуская мова (дыктоўка) і няпрофільныя — вакал, гісторыя (вусна). Перад падачай дакументаў абітурыенты праходзяць субяседванне па спецыяльнасці;

**фізічная культура, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — біялогія:** профільныя — біялогія (пісьмова), беларуская літаратура (вусна), агульная фізічная падрыхтоўка;

**фізічная культура, дадатковы напрамак падрыхтоўкі — методыка масавай фізкультурна-аздараўленчай работы; дашкольнае фізічнае выхаванне:** профільныя — біялогія (вусна), беларуская літаратура (вусна), агульная фізічная падрыхтоўка.

## ВЯЧЭРНЯЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ

***Абітурыенты, якія паступаюць на вячэрнюю форму навучання па спецыяльнасці радыёфізіка і электроніка, здаюць наступныя экзамены:***

*профільныя — фізіка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская літаратура (вусна).*

Абітурыенты, якія не вывучалі беларускую мову і літаратуру (няма адзнакі па гэтых дысцыплінах у атэстаце аб сярэдняй адукацыі), здаюць экзамен па рускай мове (дыктоўка). Гэта не датычыцца абітурыентаў, якія паступаюць на філалагічныя спецыяльнасці і спецыяльнасць педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

**Узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём,** закончыўшы сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, а таксама прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе няпоўнай сярэдняй школы з дыпломам з адзнакай здаюць адзін экзамен, які ўказаны першым для выбранай спецыяльнасці. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» — здаюць астатнія экзамены.

Такі парадак здачы ўступных экзаменаў распаўсюджваецца на асобы, якія закончылі з дыпломам з адзнакай прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе сярэдняй адукацыі пры паступленні на спецыяльнасці, адпавядаючыя атрыманым прафесіям.

Уступныя экзамены (акрамя экзамену па музыцы, малюнку, агульнай фізічнай падрыхтоўцы) праводзяцца па праграмах, адпавядаючых вучэбным праграмам сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Залічэнне праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных паступаючымі на ўступных профільных экзаменах, пры атрыманні станоўчых адзнак на няпрофільных экзаменах.

Асобы, якія закончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём і паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці па мэтаваму прыёму, могуць быць залічаны на падставе вынікаў творчай гутаркі, якая будзе праводзіцца перад уступнымі экзаменамі. Асобы, якія не залічаны па выніках творчай гутаркі, здаюць адпаведныя ўступныя экзамены.

Асобы, якія паступалі ва універсітэт і не прайшлі па конкурсу, могуць быць залічаны звыш плана на падставе дагавораў з прадпрыемствамі і арганізацыямі аб падрыхтоўцы спецыялістаў з аплатай кошту навучання. **Прадпрыемства або арганізацыі могуць накіраваць на вучобу з аплатай навучання і абітурыентаў, якія прайшлі па конкурсу. Кошт навучання за год для дзённай формы складае:**

**эканамічныя, правазнаўчыя і інжынерныя спецыяльнасці — 22000 рублёў, педагагічныя спецыяльнасці — 20000 рублёў, для вячэрняй формы навучання па спецыяльнасці радыёфізіка і электроніка — 11000 рублёў.**

З 1 па 12 ліпеня для абітурыентаў ва універсітэце працуюць платныя падрыхтоўчыя курсы. Кошт навучання 470 рублёў. Грошы неабходна пералічваць на **разліковы рахунак універсітэта № 609779 у Камерцыйным банку г. Гродна, МФО 406518. Код банка: 705.**

На пераліковай квітанцыі пасля адрасу універсітэта абітурыентам павінна быць пастаўлена адзнака «ПК».

Дакументы накіроўвайце на адрас: **230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, універсітэт, прыёмная камісія. Тэл.: 44-51-03.**

# ВАС ЗАПРАШАЮЦЬ ФАКУЛЬТЭТЫ

## ГІСТАРЫЧНЫ



*Гістарычны факультэт у нашым універсітэце быў заснаваны ў 1954 г. Спачатку ён функцыяніраваў як гістарычны і гісторыка-філалагічны, рыхтуючы настаўнікаў гісторыі, рускай і беларускай мовы і літаратуры. З 1967 года факультэт стаў называцца гісторыка-педагагічным і выпускаць настаўнікаў гісторыі, грамадазнаўства і метадыстаў па выхаваўчай рабоце. З 1978 года факультэт рыхтуе гісторыкаў па універсітэцкаму плану. У 1983 годзе факультэт зрабіў першы выпуск гісторыкаў з універсітэцкай адукацыяй. З 1990 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй «Гісторык. Настаўнік гісторыі і сацыяльна-палітычных дысцыплін і замежнай мовы (англійскай, нямецкай, французскай)».*

*За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў больш як 5 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў. У цяперашні час на факультэце праз дзённую і завочную формы навучання праходзяць падрыхтоўку больш, чым 600 чалавек, вучэбна-выхаваўчую і навукова-даследчую работу здзяйсняе калектыў трох спецыяльных кафедр — гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх дзяржаў, усеагульнай гісторыі і шэрагу іншых кафедр універсітэта. Сярод выкладчыкаў працуюць 5 прафесараў, 30 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Высокі навуковы патэнцыял, вялікі вопыт вучэбна-выхаваўчай работы прафесарска-выкладчыцкага саставу дазваляе паспяхова весці падрыхтоўку будучых спецыялістаў-гісторыкаў.*

*Галоўная задача, якую ставіць перад сабой факультэт — гэта падрыхтаваць настаўнікаў гісторыі, грамадазнаўства і замежнай мовы сярэдняй школы. Аднак, нашы выпускнікі могуць быць размеркаваны для працы і ў іншыя навучальныя ўстановы, а таксама ў навуковыя ўстановы, сістэмы сродкаў масавай інфармацыі, экскурсійныя цэнтры, музеі, бібліятэкі, архівы, дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі.*

*Для таго, каб наш выпускнік быў на ўзроўні патрабаванняў, якія яму прад´яўляюцца, ён павінен ведаць:*

*— асновы агульнатэарэтычных дысцыплін у аб´ёме, які неабходны для рашэння педагагічных і даследчых задач, паспяховага засваення метадалагічных і прыкладных пытанняў спецыяльнасці;*

*— агульнатэарэтычныя і спецыяльныя дысцыпліны, у тым ліку: асновы археалогіі і этнаграфіі, гісторыю першабытнага грамадства, старажытнага свету, сярэдніх вякоў, гісторыю славянскіх дзяржаў, гісторыю развіцця краін свету ў новы і навейшы час, крыніцазнаўства, гісторыяграфію і інш.; а таксама дысцыпліны псіхолага-педагагічнага цыклу: педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання гісторыі;*

*— замежныя мовы (англійскую, нямецкую, французскую), методыку іх выкладання, тэарэтычную фанетыку, тэарэтычную граматыку і лексікалогію і інш.*

*Акрамя таго, кафедры факультэта праводзяць паглыбленую падрыхтоўку праз чытанне спецкурсаў і спецсемінараў па гісторыі сусветнай і айчыннай культуры са старажытных часоў да нашых дзён, беларускай нацыянальнай культуры;*

*— прынцыпы і прыёмы збору, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі і правядзення навуковых даследаванняў па профілю спецыяльнасці; практычныя пытанні рэдакціравання і падрыхтоўкі матэрыялаў да публікацыі, складання рэфератаў, аглядаў і рэцэнзій; асновы права і навуковай арганізацыі працы.*

*Будучы спецыяліст-гісторык павінен умець:*

*— прымяняць атрыманыя веды па гісторыі для рашэння канкрэтных навукова-практычных, педагагічных, інфармацыйна-пошукавых, метадычных, палітыка-выхаваўчых і іншых задач адпаведна з атрыманай спецыялізацыяй; планаваць, арганізоўваць і весці вучэбна-выхаваўчую і навукова-даследчую работу; вызначаць ступень і глыбіню вывучаемага матэрыялу, выкарыстоўваючы пры гэтым розныя прыёмы і сродкі кантролю ведаў; аналізаваць, абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт арганізацыі вучэбнага працэсу, вучэбна-метадычнай і навуковай работы:*

*— карыстацца сучаснымі метадамі вывучэння грамадкіх з´яў, працэсаў, выяўляючы і крытычна ацэньваючы іх сутнасць і генезіс; ставіць і абасноўваць мэты і задачы даследаванняў, апрацоўваць матэрыялы, складаць справаздачы і весці навуковую і тэхнічную дакументацыю;*

*— працаваць з бібліятэчнымі і музейнымі фондамі; прымяняць рацыянальныя прыёмы пошуку, адбору і выкарыстання інфармацыі, здзяйсняць яе праверку і класіфікаваць крыніцы; арыентавацца ў выпускаемай спецыльнай метадычнай літаратуры па профілю падрыхтоўкі і сумежных пытаннях;*

*— выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання і навуковага эксперыменту;*

*— садзейнічаць выяўленню і ахове гістарычных і культурных помнікаў;*

*— рэдакціраваць, рэферыраваць і рэцэнзіраваць тэксты; рыхтаваць рукапісы да публікацый і здзяйсняць аўтарскі кантроль за выданнем;*

*— прымяняць на практыцы веды і навыкі, набытыя ў вобласці навуковай арганізацыі і аховы працы; сістэматычна павышаць сваю прафесійную кваліфікацыю;*

*— весці работу па прапагандзе гістарычных ведаў.*

*Таму рыхтуйцеся, дарагія абітурыенты, да цяжкай працы.*

*Поспехаў вам!*

**В. ЧАРАПІЦА,**
**дэкан гістарычнага факультэта, прафесар.**

## ФІЗІЧНЫ

У аб´ёме ведаў, набытых чалавецтвам, фізічнай навуцы належыць вядучая роля ў развіцці сучаснага прыродазнаўства, стварэнні цэласнай карціны свету, паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Фізіка — стройны прадмет, дзе заўсёды пануе парадак, і сутнасць навучання будучага фізіка заключаецца ў тым, каб падрабязна пазнаёміць яго са стройным будынкам гэтай навукі, з якога ён ужо зможа з блізкай адлегласці паглядзець на свет прыроды.

Спецыялісты-фізікі прызваны фармуліраваць і паспяхова вырашаць новыя навуковыя праблемы на аснове ўжо вядомых і новых навуковых дасягненняў, незалежна ад таго, да якой вобласці фізікі і яе прыдаткаў гэтыя праблемы могуць быць аднесены, распрацоўваюць новыя і больш дасканалыя прыборы, устаноўкі, тэхнічныя ўстройствы, прагназіраваць перспектыўныя напрамкі развіцця навукі і тэхнікі і кваліфікавана весці выкладанне ў розных навучальных установах сучасных фізічных ўяўленняў, дасягненняў, метадаў.

У аснове адукацыі па спецыяльнасці «Фізіка» ляжыць фундаментальная падрыхтоўка. Спецыялісты павінны авалодаць спектрам фізіка-матэматычных і грамадска-палітычных ведаў, метадаў даследавання, накопленых у выніку развіцця навукі, сучаснымі метадамі праграміравання, матэматычнага мадэліравання і аўтаматызацыі эксперымента, набыць неабходныя практычныя навыкі для далейшай працы як па традыцыйных напрамках фізікі і яе прыдаткаў, так і па верагодных новых навуковых напрамках.

Другой неабходнай часткай фізічнай адукацыі на факультэце з´яўляецца агульная падрыхтоўка для данай спецыяльнасці.

Да дысцыплін па спецыяльнасці «Фізіка» (кваліфікацыя «Фізік. Выкладчык») адносяцца: методыка выкладання фізікі, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, псіхалогія, педагогіка і методыка выхаваўчай работы і інш.

Да дысцыплін па спецыяльнасці «Фізіка» (кваліфікацыя «Інжынер-фізік») адносяцца: фізічнае матэрыялазнаўства, фізічная метралогія, фізіка цвёрдага рэчыва, квантавая электроніка, метады фізіка-хімічнага аналізу, інжынерная графіка, мікраэлектроніка, спецыяльныя эканамічныя дысцыпліны і інш.

Што прапануе фізічны факультэт?

Спецыяльнасць «Фізіка» са спецыялізацыямі: квантавая электроніка, фізічная інфарматыка,



тэхнічная творчасць, а таксама па індывідуальных планах спецыялізацыі — радыёфізіка і электроніка, прыкладная оптыка, метралогія.

Выпускнікам будуць прысвойвацца наступныя кваліфікацыі:

1. Фізік. Выкладчык. Настаўнік фізікі, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Настаўнік фізікі. Арганізатар тэхнічнай творчасці.

2. Інжынер-фізік.

Сфера будучай работы:

а) сярэднія школы, сярэднія вышэйшыя навучальныя ўстановы;

б) навукова-даследчыя інстытуты і лабараторыі, канструктарскія бюро, вытворчыя аб´яднанні і інш.

Змяненне профілю.

Атрыманая адукацыя дапускае змяненне профілю работы:

— эксперыментальная фізіка;

— тэхнічнае абслугоўванне і рамонт сродкаў вымярэння і вылічальнай тэхнікі;

— сістэматычнае і прыкладное праграміраванне.

Увага!

Калі вы хочаце стаць фізікам, вам неабходна добра ведаць фізіку, матэматыку, беларускую мову і літаратуру, быць пісьменным. Усё гэта спатрэбіцца на ўступных экзаменах у час вучобы. Поспехаў вам!

**А. Каладзінскі,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

## ПРАВАЗНАЎСТВА



Факультэт правазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы быў адкрыты ў чэрвені 1978 года. У цяперашні час на факультэце навучаюцца: па дзённай форме навучання 538 студэнтаў, з іх: 46 на гаспадарчаразліковым патоку; завочнай — 367 студэнтаў і на гаспадарчаразліковым патоку пры завочным аддзяленні 269 чалавек, якія атрымліваюць вышэйшую юрыдычную адукацыю за свой кошт або за кошт прадпрыемства.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй для работы ў праваахоўных, правапрымяняльных органах і ў юрыдычных службах у народнай гаспадарцы. Як правіла, штогод студэнты размяркоўваліся для работы ў наступныя органы: пракуратура, народныя суды, натарыят, адвакатура, юрыдычныя службы на дзяржаўных прадпрыемствах, у арганізацыях і калгасах, мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, а таксама ў органы МУС і КДБ. У гэтым і ў наступныя гады студэнтам даецца магчымасць вольнага працаўладкавання. З верасня 1992 года ў адпаведнасці з пастановай Урада РБ факультэт пачынае падрыхтоўку спецыялістаў па спецыялізацыі «Знешнеэканамічная дзейнасць і міжнароднае права», вядома, з глыбокімі ведамі спецыяльных прававых дысцыплін, веданне якіх неабходна кожнаму юрысту з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй.

З 1 курса студэнты дзённага аддзялення размяркоўваюцца па наступных спецыялізацыях: дзяржаўна-прававая, гаспадарча-прававая, судзебна-пракурорска-следчая, знешнеэканамічная дзейнасць і міжнароднае прыватнае права. Спецыялізацыі забяспечваюць наступныя кафедры: дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі, якімі загадваюць: доктар юрыдычных навук, прафесар І. В. Гушчын, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Ю. І. Лутчанка, доктар юрыдычных навук, прафесар Г. А. Зорын. У жніўні 1992 года будзе адкрыта кафедра знешнеэканамічнай дзейнасці, кіравання і міжнароднага права, якую ўзначаліць буйны спецыяліст у гэтай галіне.

Па новай спецыялізацыі будуць рыхтавацца спецыялісты, якія будуць здольныя працаваць у розных структурах знешнеэканамічнай дзейнасці — біржах, СП, фірмах, канцэрнах, акцыянерных таварыствах РБ, краінах СНД і замежных дзяржавах.

На факультэце працуюць доктар юрыдычных навук, прафесар І. В. Гушчын, кандыдат юрыдычных навук, прафесар В. Т. Калмыкоў, доктар юрыдычных навук, прафесар Г. А. Зорын, вядучыя кандыдаты юрыдычных навук, дацэнты Ю. І. Лутчанка, Г. Т. Осіпава, Г. Р. Шыханцоў, В. І. Чарнышоў, В. В. Сядзельнік, М. І. Здасюк, У. У. Пячэрскі і многія іншыя, а таксама практычныя работнікі праваахоўных органаў.

На факультэце ёсць дастатковая матэрыяльная база, якая ўключае кабінет крыміналістыкі, кабінет судзебнай фатаграфіі, лабараторыю савецкага заканадаўства, абсталяваны камп´ютэрны клас, адкрываецца лабараторыя знешнеэканамічнай дзейнасці.

Пры факультэце адкрыта аспірантура на кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права, крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі.

Студэнты факультэта спалучаюць вучобу з навукова-даследчай работай, практычнай падрыхтоўкай займаюцца ў семінарах навуковых кіраўнікоў і навуковых гуртках. Лепшыя студэнцкія працы накіроўваюцца на абласны і рэспубліканскі конкурсы. Штогод студэнты прымаюць удзел у навуковых канферэнцыях ва універсітэце і іншых вузах краіны, удзельнічаюць у рэспубліканскіх алімпіядах і конкурсах.

Ва універсітэце ёсць добрая спартыўная база, большасць студэнтаў актыўна займаюцца ў розных спартыўных секцыях, маюць спартыўныя разрады і званні майстроў спорту.

Студэнты ўдзельнічаюць у гуртках мастацкай самадзейнасці пры факультэце грамадскіх прафесій універсітэта.

**І. Гушчын,**
**дэкан факультэта правазнаўства, доктар юрыдычных навук, прафесар.**

## ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

*ФГП універсітэта дае магчымасць студэнтам атрымаць другую прафесію. Пры факультэце грамадскіх прафесій працуюць наступныя калектывы:*

*— аркестр народных інструментаў;*

*— духавы аркестр;*

*— народны хор;*

*— ансамбль бальнага танцу;*

*— студэнцкі тэатр эстрадных мініацюр;*

*— вакальна-інструментальны ансамбль;*

*— секцыя сольных спеваў;*

*— секцыя бібліятэказнаўства.*

*Акрамя таго пры факультэце грамадскіх прафесій працуюць платныя курсы:*

*— сакратароў-рэферэнтаў;*

*— экскурсаводаў;*

*— манекеншчыц;*

*— сакратароў-машыністак.*

*Пасля сканчэння курсаў выпускнікам, якія паспяхова здалі выпускныя экзамены, выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору, якое дае права працаваць па выбранай спецыяльнасці.*

**Р. Левін**
**дэкан ФГ**

# ВАС ЗАПРАШАЮЦЬ ФАКУЛЬТЭТЫ

## Факультэт давузаўскай падрыхтоўкі

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

**аб ´яўляе набор слухачоў на ФАКУЛЬТЭТ ДАВУЗАЎСКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ (ФДП), на якім яны атрымаюць веды, неабходныя для ПАСТУПЛЕННЯ ВА УНІВЕРСІТЭТ І іншыя ВНУ**

**ФДП мае філіялы ў Лідзе, Смаргоні і Ваўкавыску.**

На факультэце вывучаюцца наступныя прадметы, па якіх неабходна здаваць уступныя экзамены ва універсітэт: матэматыка, інфарматыка, фізіка, біялогія, хімія, гісторыя, руская мова, беларуская мова, руская літаратура, беларуская літаратура, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура (вячэрняя і завочная формы навучання); замежная мова (англійская, нямецкая, французская, польская), малюнак, жывапіс, кампазіцыя, спецінструмент, тэорыя музыкі і сальфеджыо, вакал (вячэрняя форма навучання).

**На ФДП залічваюцца:** вучні выпускных класаў сярэдняй школы, тэхнікумаў, прафтэхвучылішчаў, а таксама асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і жадаюць паступіць у Гродзенскі універсітэт і іншыя ВНУ.

Для тых, хто навучаецца на ФДП, прадстаўляецца магчымасць вывучаць **ЛЮБУЮ КОЛЬКАСЦЬ ПРАДМЕТАЎ**, у залежнасці ад профілю выбранага факультэта. Слухачы ФДП здаюць выпускныя экзамены ў маі 1993 г. , вынікі якіх залічваюцца прыёмнай камісіяй як уступныя ва універсітэт. З усімі атрыманымі адзнакамі («3», «4», «5» па профільных і «залічана» па няпрофільных экзаменах) яны могуць удзельнічаць у конкурсе пры паступленні ва універсітэт на дзённую, вячэрнюю або завочную форму навучання. Слухачы ФДП маюць права здаваць, даздаваць нехапаючыя) уступныя экзамены на агульных падставах у ліпені.

Пры паступленні ва універсітэт выпускнікі ФДП карыстаюцца правам пераважнага залічэння пры іншых роўных умовах.

**ВУЧОБА НА ФДП НЕ ТОЛЬКІ ПАВЫСІЦЬ УЗРОВЕНЬ ВАШАЙ ПАДРЫХТОЎКІ, але і ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВАШЫ ШАНСЫ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ УНІВЕРСІТЭТА**

Заняткі на ФДП вядуць высокакваліфікаваныя выкладчыкі універсітэта, якія маюць вялікі вопыт работы са школьнікамі.

Слухачы вячэрняга аддзялення займаюцца па чатыры гадзіны ў тыдзень па кожнаму прадмету. Для тых, хто навучаецца на завочным аддзяленні, сістэматычна праводзяцца аднадзённыя сесіі.

### УМОВЫ АПЛАТЫ
### За 8 месяцаў вучобы

**1950 рублёў** — за адзін прадмет, па якім ёсць вячэрняя і завочная формы навучання.

**2950 рублёў** — за адзін прадмет, па якім ёсць толькі вячэрняя форма навучання (групы не болей 10-12 слухачоў).

Сіротам, выхаванцам дзіцячых дамоў, воінам-інтэрнацыяналістам і інвалідам даецца магчымасць **БЯСПЛАТНАГА** навучання на ФДП пасля прад ´яўлення адпаведнага дакумента.

### ТЭРМІНЫ І ПАРАДАК ПАДАЧЫ ДАКУМЕНТАЎ

Слухачы ФДП прадстаўляюць:

1. Заяву ўстаноўленага ўзору, у якой указваюць: прозвішча, імя, імя па бацьку, дамашні адрас (з указаннем паштовага індэкса), тэлефон, звесткі аб месцы працы або вучобы, выбраныя для вывучэння прадметы (з указаннем формы навучання) і факультэт, на які збіраюцца паступаць.

2. Дакумент аб уплаце грошай за навучанне (або аб праве на льготы).

Грошы за навучанне пералічваюцца на **разліковы рахунак універсітэта № 609779 у Камбанку г. Гродна (з паметай ФДП).**

**Асобам, якія спынілі вучобу без уважлівых прычын, выплачаная сума не звяртаецца.**

**Дакументы неабходна прадставіць да 10 верасня поштай на адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, універсітэт, ФДП,** або прад ´явіць асабіста ва **аўд. 325** на ўказаны адрас з 9.00 да 18.00 (акрамя суботы і нядзелі).

Заняткі на вячэрняй форме навучання пачынаюцца з 14 верасня 1992 года, на завочнай — з 1 кастрычніка.

Даведкі і інфармацыю па пытаннях, якія Вас цікавяць, можна атрымаць па тэлефонах: **44-82-59 (Гродна); 2-07-42 (Ліда); 2-13-85 (Смаргонь); 2-39-92 (Ваўкавыск).**

## ФІЛАЛАГІЧНЫ

Горад Гродна гістарычна і геаграфічна належыць да розных культур і традыцый — беларускай, польскай, рускай. Канцэпцыя моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і адпаведная ёй тыпалогія школ з рознымі мовамі навучання, якую прапанавала Міністэрства адукацыі РБ, патрабуюць настаўнікаў, якія б валодалі некалькімі мовамі (славянскімі і неславянскімі).

На філалагічным факультэце, які мае багатую гісторыю, вядзецца падрыхтоўка настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, рускай і беларускай, рускай і польскай, польскай і беларускай моў і літаратур. У перспектыве (і першыя крокі ўжо зроблены) плануецца падрыхтоўка славеснікаў, якія маглі б выкладаць рускую і замежную, рускую мову як замежную, працаваць перакладчыкамі, настаўнікамі сусветнай культуры.

Факультэт мае два аддзяленні — русістыкі і паланістыкі, на першым — дзённую і завочную формы навучання.

Навучанне ажыццяўляюць пяць кафедр: агульнага і славянскага мовазнаўства, рускай мовы, рускай і замежнай літаратуры, польскай мовы, польскай літаратуры. Калектыў улюбёных у сваю працу выкладчыкаў, сярод якіх 3 доктары і звыш 20 кандыдатаў навук, дае магчымасць будучаму настаўніку-філолагу пазнаёміцца з самымі рознымі галінамі філалогіі: асвоіць яшчэ некалькі моваў (стараславянскую, лацінскую, балгарскую), акунуцца ў гісторыю моваў і літаратур, пачынаючы з антычных часоў, вывучаць вусную творчасць рускага, беларускага і польскага народаў. Студэнты выязджаюць на фальклорную і дыялекталагічную практыкі ў раёны Гродзеншчыны і ў Рэспубліку Польшчу.



На факультэце склалася добрая традыцыя: праводзіць навуковыя чытанні ў гонар нашага земляка, слыннага філолага, акадэміка Я. Ф. Карскага.

Філолагі ўмеюць не толькі вучыцца і працаваць, але і адпачываць. Спрабуюць студэнты свае паэтычныя сілы ў аб ´яднанні «Наднёманскія галасы», многія філолагі могуць знайсці прымяненне сваім музычным і іншым талентам на факультэце грамадскіх прафесій.

**М. КАНЮШКЕВІЧ,**
**дэкан філалагічнага факультэта, доктар філалагічных навук, прафесар, выпускніца гэтага факультэта.**

## ФАКУЛЬТЭТ ПЕДАГОГІКІ І МЕТОДЫКІ ПАЧАТКОВАГА НАВУЧАННЯ

**Няма таго чалавека, які б з вялікай удзячнасцю не ўспамінаў сваю першую настаўніцу. Тую САМУЮ, САМУЮ..., якая дапамагла зрабіць першыя крокі ў «краіну ведаў». А калі настаўніца навучыла не толькі чытаць, пісаць, лічыць, але і змагла прывіць любоў да цудоўнага, непаўторнага: навучыла маляваць, спяваць, іграць на музычным інструменце, вырабляць цацкі з розных матэрыялаў, заклала ў душу маленькага чалавека агеньчык дабрыні і справядлівасці!**

**Усяму гэтаму можна навучыцца на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Але кожны абітурыент павінен: ЛЮБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ, МЕЦЬ ДОБРЫЯ ВЕДЫ І ЗДОЛЬНАСЦІ, БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ ВЯЛІКАЙ ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦІ.**

**Займацца на факультэце нялёгка.., але цікава. Нялёгка таму, што студэнты вывучаюць шмат разнастайных дысцыплін, з першага курса выходзяць на практыку, авалодваюць дадатковай спецыяльнасцю, удзельнічаюць у навуковай працы, займаюцца ў гуртках па інтарэсах. А цікава таму, што няма часу сумаваць.**

**Студэнт нашага факультэта ўвесь час заняты працай над сабой на занятках, у школах, у канцэртнай зале, на выставе выяўленчага мастацтва, на стадыёне ці тэнісным корце, у бібліятэцы ці лабараторыі.**

**ЗАПРАШАЕМ ДА НАС. ВАШЫ ЗДОЛЬНАСЦІ НА НАШЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ МОГУЦЬ РАЗВІЦЦА Ў ПОЎНАЙ МЕРЫ.**

**П. ГАЛУЗА,**
**дэкан факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.**



## МАТЭМАТЫЧНЫ



*Дацкі фізік Нільс Бор сказаў, што матэматыка з ´яўляецца значна большым, чым навука, таму што яна з ´яўляецца моваў навукі. Зразумела, што без сучаснай матэматыкі быў бы немагчымы прагрэс фізікі, інжынернай справы і арганізацый прамысловасці. Роля матэматыкі ў пазнанні сусвету, у практычнай дзейнасці чалавека такая вялікая, што наш час называюць эпохай матэматызацыі ведаў.*

*На факультэце ідзе падрыхтоўка матэматыкаў на педагагічным (план прыёму 75 чалавек) і вытворчым (план прыёму 25 чалавек) кірунках. На педагагічным аддзяленні рыхтуюцца спецыялісты з кваліфікацыяй «Матэматык. Выкладчык матэматыкі, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі», і спецыялісты з кваліфікацыяй «Матэматык. Выкладчык матэматыкі і фізікі».*

*У апошні час у вучэбны працэс педагагічнага аддзялення ўведзены дысцыпліны, якія накіраваны на ўзмацненне прафесійнай падрыхтоўкі ў галіне інфарматыкі. Інфарматыка разглядаецца таксама як вучэбная дысцыпліна, якая разам з матэматыкай, гуманітарным цыклам прадметаў садзейнічае фарміраванню інтэлектуальных здольнасцей студэнтаў.*

*Вялікім попытам будуць карыстацца выпускнікі факультэта з кваліфікацыяй «Выкладчык матэматыкі і фізікі». Ёсць многа школ, у якіх вучэбная нагрузка па фізіцы невялікая, таму такое спалучэнне ў падрыхтоўцы спецыялістаў з ´яўляецца карысным.*

*У апошні час шмат зроблена для ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў на вытворчым аддзяленні. Студэнты вывучаюць матэматыку і праграмнае забеспячэнне вылічальных сістэм. Прадпрымаюцца захады па павелічэнню колькасці спецыялізацый на гэтым аддзяленні з мэтай, каб падрыхтоўка насіла асабісты характар і была непасрэдна разлічана на спажыўца.*

*Факультэт укамплектаваны высокакваліфікаванымі кадрамі, 5 з якіх з ´яўляюцца дактарамі навук, прафесарамі, 32 — дацэнтамі, кандыдатамі навук. Некаторыя з выкладчыкаў запрашаліся ў іншыя краіны для чытання лекцый. Так, напрыклад, прафесар А. А. Пякарскі чытаў лекцыі на працягу двух месяцаў у Тэхаскім універсітэце ЗША.*

*Матэматычны факультэт мае вялікі вопыт супрацоўніцтва з сярэднімі ўстановамі ў арганізацыі паглыбленага вывучэння матэматыкі. Выкладчыкі факультэта выкладаюць матэматыку ў школе-ліцэі № 1 і школе-гімназіі ў г. Гродна. На наш погляд, геаграфію такога супрацоўніцтва можна было б пашыраць. Ёсць шмат школ па-за межамі г. Гродна з добрымі матэматычнымі традыцыямі, а з дапамогай матэматычнага факультэта універсітэта яны маглі б стаць цэнтрамі падрыхтоўкі таленавітых матэматыкаў.*

**Я. Роўба,**
**дэкан матэматычнага факультэта.**



# ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ І КУЛЬТУРЫ

*Ва ўсе часы і ва ўсіх універсітэтах з даўнімі традыцыямі філалогія ўваходзіла ў склад асноўных навучальных дысцыплін. Жывое слова, якое абуджала высокія пачуцці, узвышаныя ўяўленні як пра чалавека, так і пра цэлыя народы, а ўрэшце і сама філалогія як спецыфічная галіна чалавеказнаўства — усё гэта цягам даўніх стагоддзяў змушала з павагай ставіцца да філалагічнай адукацыі.*

*Факультэт — адзін з самых маладых у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Утварыўся ён у 1991 годзе як практычная рэалізацыя даўнішняй мары аб выхаванні беларускай гуманітарнай інтэлігенцыі. Гэта надзвычай высакародная задача, бо, як вядома, краевугольным камнем у падмурак народнай трываласці закладваецца найперш культура народу.*

*Кафедры факультэта ажыццяўляюць профільную спецыялізацыю ў галіне беларускай культуры, літаратуры і мовы. Распрацоўваюцца і чытаюцца курсы, спецкурсы, многім з якіх няма аналагаў у навучальных установах рэспублікі. Асабліва гэта датычыцца дысцыплін, звязаных з беларускай культурай, бо размяшчэнне факультэта ў Гродне, своеасаблівым горадзе-музеі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, несумненна паспрыяе практычнаму засваенню культурнай спадчыны беларускага народу. Шмат плёну дадуць і веды, набытыя пры вывучэнні гісторыі і этнаграфіі Беларусі, беларускай міфалогіі, гісторыі кніжнай культуры, дойлідства і архітэктуры, жывапісу і музыкі, розных рэлігійных веравызнанняў, геральдычных знакаў беларускіх гарадоў.*

*Пры гэтым розныя літаратуразнаўчыя, мовазнаўчыя, культуралагічныя навукі знаходзяць агульныя кропкі судакранання, заходзяць у «счапленне» паміж сабой — і праз гэта ўвачавідкі паўстае цэласны мацярык духоўнай культуры беларусаў, мацярык яшчэ не абжыты, не асвоены, а таму — поўны загадак і таямніц, дзе ўтульна пачуваюць сябе веды пра этнагенез і гісторыю, духоўны ўклад нашага народу, яго ўменне ствараць як абарончыя збудаванні, так і выдатныя храмы, кнігі, музыку. Акрамя асноўных ведаў па беларускай культуры, літаратуры, мове, шмат увагі ўдзяляецца вывучэнню замежных моў, у тым ліку — адной заходнееўрапейскай і адной са славянскіх.*

*Навучанне ажыццяўляе калектыў вопытных выкладчыкаў, сярод якіх — чатыры прафесары, два доктары навук, два члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. На факультэце працуюць навуковыя і творчыя лабараторыі, актыўна функцыяніруе літаратурнае аб'яднанне «Наднёманскія галасы», фальклорны гурт. У перспектыве адчыняць свае дзверы майстэрні народных рамёстваў, дзе можна ўдасканаліць свае ўменьствы ў галіне ткацтва і вышывання, лепкі, разбярства, чаканкі, пляцення з саломкі, лазы і г. д. Распачне працу студэнцкі тэатр-студыя. Ну і, вядома ж, спадзяёмся, што не будзе пуставаць зала літаратурнай гасцёўні, куды запрашаюцца вядомыя дзеячы літаратуры, культуры, навукі.*

*Факультэт пачынае сваю гісторыю. Пісаць яе старонкі належыць вам. А гэта нялёгкая, але пачэсная і радасная праца.*

**І. Жук,**
**дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры.**

# ІНЖЫНЕРНЫ

Наш факультэт з'яўляецца адным з самых маладых ва універсітэце, створаны ён 1 верасня 1990 года. Інжынерны факультэт аб'ядноўвае тры кафедры: радыёфізікі і электронікі, інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі, прыкладной оптыкі. Заняткі праводзяцца па дзённай і вячэрняй формах навучання. Выпускнікі дзённага аддзялення атрымліваюць наступныя спецыяльнасці: 19.10 — «Аптычныя прыборы і сістэмы» (з прысваеннем кваліфікацыі інжынер-оптык-тэхнолаг); 23.02 — «Радыёфізіка і электроніка» (з прысваеннем кваліфікацыі радыёінжынер).

Большая частка спецыялістаў рыхтуецца па тыповых дагаворах з прадпрыемствам, з улікам індывідуальных асаблівасцей і профілю будучай работы. Выпускнікі факультэта працуюць на вядучых прадпрыемствах горада і рэспублікі, як ВА «Волна», завод «Радыёпрыбор», Лідскі завод «Оптык», ВА «Азот» і інш.

Вучэбны працэс па ўсіх спецыяльнасцях уключае ў сябе як фундаментальную фізіка-матэматычную падрыхтоўку, так і спецкурсы: узмацняльныя ўстройствы, мікрасхематэхніка, радыёпрыёмныя і перадаючыя ўстройствы, ЗВЧ і тэхніка, статыстычныя радыёвымярэнні, мікрапрацэсарная тэхніка, тэлебачанне, устройства і прынцыпы эксплуатацыі выкарыстоўваемых у оптыка-механічнай вытворчасці станкоў і абсталявання, аптычных і оптыка-электронных прыбораў, тэхналогія варкі шкла, аптычных дэталяў і пакрыццяў, зборкі аптычных прыбораў, сучасныя аптычныя метады вымярэння, дыягностыкі і кантролю, метады апрацоўкі аптычнай інфармацыі, асновы прыкладной аптычнай галаграфіі, надзейнасць радыёэлектроннай апаратуры, выпраменьванне і распаўсюджванне радыёхваль, радыёэлектронныя сістэмы, тэхналогія вытворчасці РЭА, САПР і работатэхніка, асновы маркетынга і менеджмента і г. д.

Па названых спецыяльнасцях ёсць таксама і аспірантура. Прафесарска-выкладчыкі састаў забяспечвае арганізацыю вучэбнага працэсу. Для чытання асобных лекцый па некаторых дысцыплінах запрашаюцца вядучыя спецыялісты прадпрыемстваў горада. Па ўсіх спецдысцыплінах на факультэце ёсць вучэбныя лабараторыі, якія забяспечаны сучасным абсталяваннем і вылічальнай тэхнікай.

Інжынер павінен дасканала валодаць сваёй спецыяльнасцю, мець добрую навуковую і практычную падрыхтоўку, быць умелым арганізатарам, які здольны на практыцы прымяняць прынцыпы навуковай арганізацыі працы, умець працаваць з людзьмі, крытычна ацэньваць дасягнутае, пастаянна выхоўваць у сабе любоў да працы, дзелавітасць, імкненне да новага, перадавога, адказна адносіцца да ўскладзеных на яго абавязкаў. Ён павінен валодаць высокай культурай, свабодна валодаць пісьмовай і вуснай літаратурнай рускай (беларускай) мовай, прафесіянальна



карыстацца хоць адной замежнай мовай, валодаць шырокай эрудыцыяй, навыкамі бесперапыннага духоўнага і фізічнага самаўдасканалення.

**Ю. Бейцюк,**
**дэкан інжынернага факультэта.**

# БІЯЛАГІЧНЫ



*Факультэт рыхтуе спецыялістаў для педагагічнай, навукова-даследчай і вытворчай дзейнасці ў галіне біялогіі.*

*Вучэбны план па спецыяльнасці 01.09 — «Біялогія» уключае: батаніку, заалогію, гісталогію, эмбрыялогію, анатомію і фізіялогію чалавека, фізіялогію раслін і жывёл, мікрабіялогію, біяхімію і біяфізіку, асновы біятэхналогіі і імуналогіі, генэтыку і селекцыю, малекулярную біялогію, тэорыю эвалюцыі, экалогію.*

*Праграма біялагічнага выхавання ахоплівае розныя ўзроўні вывучэння жывой матэрыі — ад малекулярнай арганізацыі асобнай клеткі да механізмаў узаемадзеяння цэласнага арганізма з навакольным асяроддзем, знаёміць з разнастайнасцю жывёл і раслін, заканамернасцямі іх фарміравання і развіцця, размеркаваннем, эвалюцыяй і сістэматыкай відаў.*

*Акрамя спецыяльных дысцыплін забяспечваецца падрыхтоўка па грамадскіх і агульнатэарэтычных прадметах, педагогіцы і псіхалогіі, беларускай нацыянальнай культуры.*

*Усе выпускнікі факультэта атрымліваюць дзве спецыяльнасці. У аснове кваліфікацыі «Біёлаг. Настаўнік біялогіі і хіміі» ляжыць глыбокае вывучэнне разам з біялогіяй шэрагу хімічных дысцыплін. На старэйшых курсах гэта група студэнтаў можа спецыялізавацца ў вобласці біяхіміі. Студэнты авалодваюць сучаснымі біяхімічнымі метадамі даследавання, праходзяць вучэбную практыку ў інстытуце біяхіміі АН БССР, выконваюць дыпломную работу па хіміі ці біялогіі, удзельнічаюць у навуковых даследаваннях, якія праводзяцца калектывамі кафедр біяхіміі і біятэхналогіі. Такая падрыхтоўка дазваляе выпускніку не толькі выкладаць хімію, але і працаваць у хімічных і біяхімічных лабараторыях рознага профілю.*

*Частка студэнтаў выбірае спецыялізацыю «Экалогія і ахова прыроды навакольнага асяроддзя», якая дае магчымасць глыбей даведацца аб экалагічных аспектах батанікі, заалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл. Вучэбная практыка па гэтай спецыялізацыі ўключае знаёмства з работай гарадскіх лабараторый, якія ацэньваюць якасць асяроддзя. Студэнты засвойваюць метады вызначэння чысціні паветра, вады, харчовых прадуктаў, вывучаюць работу ачышчальных збудаванняў, метэастанцыі і іншых гарадскіх служб, якія кантралююць экалагічную сітуацыю ў горадзе. Навукова-даследчая работа студэнтаў гэтай спецыялізацыі і тэматыка дыпломных работ прысвечаны праблеме маніторынга прыродных біяцэнозаў у рэгіёне, якая распрацоўваецца кафедрай біялогіі і кафедрай анатоміі і фізіялогіі чалавека.*

*Другая кваліфікацыя выпускніка нашага факультэта — «Настаўнік біялогіі. Практычны псіхолаг ва ўстановах народнай адукацыі». Студэнты гэтай групы вывучаюць дадаткова ўсе спецыяльныя дысцыпліны факультэта псіхалогіі, авалодваюць шэрагам сучасных метадаў псіхадыягностыкі, псіхатрэнінга і псіхакарэкцыі. Гэта не толькі істотна павышае ўзровень іх падрыхтоўкі да педагагічнай і выхаваўчай работы з дзецьмі, але і дае ім спецыяльнасць практычнага псіхолага, у якіх ёсць патрэба ў сучасных школах.*

*На факультэце адкрыта падрыхтоўка спецыялістаў яшчэ адной кваліфікацыі «Настаўнік біялогіі і геаграфіі», што дасць нам магчымасць пазбавіцца дэфіцыту географаў і глебазнаўцаў, які існуе ў нашым рэгіёне.*

*Не гледзячы на тое, што факультэт існуе менш, чым 10 гадоў, ён мае ўжо аўтарытэт у рэспубліцы. Выкладчыцкі састаў кадраў валодае высокім прафесіяналізмам, вучэбныя лабараторыі забяспечаны неабходным абсталяваннем і апаратурай.*

*Нашы студэнты штогод займаюць першае-другое месцы сярод рэспубліканскіх вузаў на алімпіядах па біялогіі. Кожны пяты выпускнік працуе ў навуковых установах.*

**Н. Паўловіч,**
**дэкан біяфака.**

# ФАКУЛЬТЭТ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Факультэт фізічнай культуры ў нашым універсітэце адзін з самых маладых. У 1992 годзе мы зробім чацвёрты набор студэнтаў на дзённае і трэці на завочнае навучанне. На стацыянары план набору складае 100 чалавек, завочнікаў — 50 чалавек.

На нашым факультэце ёсць магчымасць падрыхтаваць спецыялістаў па здвоеных спецыяльнасцях, або па дадатковай спецыялізацыі: «Фізічная культура і біялогія», «Фізічная культура і дашкольнае фізічнае выхаванне», «Фізічная культура і масавая фізкультурна-аздараўленчая праца».

Такі падыход істотна пашырыць базавую фізкультурную падрыхтоўку, дазволіць нашым выпускнікам больш вольна адчуваць сябе пры працаўладкаванні пасля сканчэння факультэта.

Мы імкнемся паглыбіць медыка-біялагічную падрыхтоўку нашых студэнтаў, каб стварыць добрую тэарэтычную аснову для разумення складаных механізмаў дзеяння фізічных практыкаванняў на арганізм чалавека.

Наш выпускнік павінен стаць асноўнай фігурай у справе ажыццяўлення ідэй здаровага ладу жыцця, штодзённа ўносячы свой уклад у справу паляпшэння фізічнай сталасці і здольнасцей жыхароў Беларусі.

У новым навучальным годзе факультэт цалкам зойме будынак і спартыўныя памяшканні тэхнікума фізічнай культуры, які спыняе сваё існаванне са жніўня 1992 года. Гэта дазволіць студэнтам больш грунтоўна займацца вучобай, выкананнем навуковых даследаванняў, павышэннем спартыўнага майстэрства.

На факультэце адкрыта вучэбная лабараторыя тэорыі і методыкі фізічнай культуры, лабараторыя фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны, разварочвае сваю дзейнасць малое прадпрыемства «Універсітэцкі фізкультурна-аздараўленчы цэнтр», дзе вядзецца падрыхтоўка масажыстаў, метадыстаў па дашкольнаму фізічнаму выхаванню, працуюць групы аэробікі, кабінет іглярэфлексатэрапіі.

Узначальваюць педагагічны працэс 1 прафесар, 6 дацэнтаў, 3 кандыдаты навук.

Вядучую кафедру факультэта — кафедру тэорыі і методыкі фізічнай культуры — узначальвае кандыдат педагагічных навук, дацэнт У. А. Баркоў. Кіраўніцтва кафедрай спартыўных гульняў узяў на сябе адзін з вопытнейшых працаўнікоў вышэйшай школы Гродзеншчыны дацэнт У. М. Карчэўскі.

Свой вопыт і багатыя веды перадае моладзі доктар медыцынскіх навук, прафесар А. І. Яроцкі, вядомы ў нашай краіне і за яе межамі сваімі навуковымі працамі. Добра ўспрымаецца нашымі студэнтамі вядомы ў свеце трэнер, загадчык кафедры фізічнага выхавання В. А. Максімовіч, які выхаваў цэлую плеяду барцоў высокага класу. Да педагагічнай дзейнасці на факультэце далучылася і былая алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы А. У. Цюненкова (Валчэцкая), якой ёсць што перадаць



цяперашняму пакаленню студэнтаў.

Педагагічны калектыў факультэта чакае новага папаўнення.

**Г. Гайдашоў,**
**дэкан факультэта фізічнай культуры.**




Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штодыднёва
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15 00.

Наклад 2 000 экз.    Зак. 2932

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

*В. а. рэдактара*
*Г. М. Каменева*